**Р.Ф.Харытончык,**
*ст. навуковы супрацоўнік*

# ПРАВАСЛАЎЕ І ТЭАТР

З даўніх часоў хрысціянства адмоўна ставілася да тэатра. Святіцель Іаан Златавуст называў тэатр “школай страсцей”, святіцель Ігнацій Бранчанінаў – “язычніцкім храмам Муз і Апалона”. Святы праведны Іаан Кранштацкі лічыў, што “тэатр – школа свету гэтага і князя свету гэтага – д’ябла”. “Што нясуць тэатры ў чалавечае сэрца? – пісаў ён у сваім духоўным дзённіку “Маё жыццё ў Хрысце”, – дух гэтага веку – дух марнасці, пустаслоўя, смехатворнасці, дух ганарлівасці і хітрасці, і нікому ніякай маральнасці не даюць. Замест храмаў свет выдумаў свае храмы – храмы мітусні: тэатры, цыркі; замест Бога і святых у свеце ўслаўляюць да абагаўлення сваіх знакамітасцей – акцёраў, спевакоў, жывапісцаў, літаратараў”. На думку епіскапа Арсенія (Жаданоўскага), “тэатры – гэта тыя ж капішчы, дзе адбываецца служэнне каму заўгодна, – толькі не Богу”.

Аднак сярод гэтых рэзка адмоўных выказванняў пра тэатр гучаць і словы ў яго падтрымку. Так, напрыклад, святіцель Дзімітрый Растоўскі не толькі любіў тэатр, але і нават пісаў для яго містэрыі. Пісалі для тэатра таксама святіцель Георгій Каніскі (трагікамедыя “Уваскрэсенне мёртвых”) і іншыя духоўныя асобы. Сімяон Полацкі ў сваіх дыдактычных п’есах (“Камедыя-прытча пра блуднага сына”, “Пра Навухаданосара-цара” і інш.) імкнуўся не толькі асучасніць біблейскія прытчы, але і наблізіць іх да актуальных выхаваўчых праблем. Менавіта яму належыць пашана заснавальніка першага ў Расіі тэатра, які быў створаны ў 1672 г. пры двары цара Аляксея Міхайлавіча. Зразумела, гэта быў зусім іншы тэатр, чым сучасны.

Упершыню духоўныя драмы, ці містэрыі, нарадзіліся ў нетрах заходнехрысціянскай каталіцкай культуры. На Русі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дапамагчы дзіцяці напоўніць яго духоўны свет, знайсці сваё месца на зямлі – асаблівая місія тэатра. Звычайны чалавек здольны ўзняцца да вяршынь духу толькі ў працэсе суперажывання. І гэта можа здзейсніць менавіта тэатр.

У кожнага чалавека час ад часу з'яўляецца патрэба абстрагавацца ад паўсядзённага жыцця, убачыць перамогу справядлівасці і пачуць ўзнёслыя словы. Таму, калі тэатр апускаецца да пошласці, ён абавязкова спараджае падзенне нораваў.

Сапраўдны тэатр павінен садзейнічаць акультурванню нораваў. Гэтага можна дабіцца толькі тады, калі кожны спектакль, нават калі ён і забаўляльны, будзе змяшчаць ў сабе вялікі агульначалавечы сэнс, а драматычныя творы будуць прапагандаваць маральнасць.

На думку архіепіскапа Сан-Францыскага Іаана (Шахаўскога), неабходны толькі такі тэатр, які імкнецца ачысціць першыя пласты бруду, якія ляжаць на духу чалавечым у міру.

Такім чынам, для тых, хто не спазнаў света хрысціянскага жыцця, тэатр можа быць своеасаблівым узвышэннем над звыклымі абставінамі іх існавання.

У адным з інтэрв'ю народнай артысткі Расіі Кацярыны Васільевай прагучалі словы, што "тэатр – гэта вельмі тонкая духоўная атрута, а кожнае тэатральнае дзеянне – вытанчаны наркотык, які раз'ядае ў любым выпадку, і наогул акцёрскую прафесію немагчыма сумясціць з хрысціянствам, паколькі кампаненты, якія ёй спадарожнічаюць, – гэта смяротныя грахі: славалюбства, ганарлівасць, самаўсхваленне, самазахапленне і хлусня". Між тым А.П.Чэхаў, калі яго пераконвалі ў тым, што хлусня – умова існавання сцэны, з гэтым не пагаджаўся і даказваў, што ніякія ўмовы не апраўдваюць хлусні.

Зыходзячы ж з думкі святога Іаана Кранштацкага аб тым, што "стваральнікі п'ес і акцёры перадаюць народу тое, што маюць у сабе, свой дух, ні больш і ні менш", можна

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адзначыць: многае ў тэатры залежыць ад духоўнага свету самога акцёра. І таму цяжка не пагадзіцца са словамі заслужанага артыста Беларусі Віктара Манаева: “Акцёрская прафесія, як ніякая іншая, правакуе на самыя згубныя заганы: фанабэрыю і славалюбства. Трэба ўсяму гэтаму ставіць у душы надзейную заслону. Адзіная ўмова, якая дапаможа захаваць душу жывой, – вера ў Бога і малітва. Гэты шчыт засцеражэ ад наступу на душу смертаносных сіл, стрэл славалюбства і пыхлівасці, памылковага ўяўлення, што ты выключны ў параўнанні з іншымі, варты большага поспеху… Калісьці тэатр быў толькі сродкам забавы, прытулкам распусты, вакханалій, таму хрысціянства было супраць яго. Але няма ў свеце такіх прылад, якія б не маглі служыць Богу. Тэатр робіць бачным тое, чаго мы ў жыцці не заўважаем з прычыны духоўнай слепаты, мітусні, паглыблення ў пустыя турботы, зацыкленасці на саміх сабе. Толькі жывая, трапяткая душа можа адгукацца на падзеі навокал.”

Менавіта праз тэатральныя сродкі можна прапагандаваць маральнасць і хрысціянскія каштоўнасці.

**О.Л.Хмурчик,**
*магистрант*

## ФОРМЫ МОЛОДЕЖНОЙ СУБКУЛЬТУРЫ

Молодежная субкультура, как и другие виды субкультур, заполняют ниши в традиционной культуре, те сферы жизнедеятельности, на которые установленные нормы и ценности социума не имеют достаточного влияния.

Молодежная субкультура (лат. sub — под, около; cultura — возделывание, обработка) — “нетрадиционная система, объединяющая молодых людей, сообщество, находящееся в промежутках социальной структуры — вне ее” [1].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ